## Падведзены вынікі конкурсу п'ес «Францыск Скарына і сучаснасць»

# Галоўны герой — першадрукар

---

- 20.10.2016

**Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

---



Пераможцы конкурсу «Францыск Скарына і сучаснасць» Сяргей Кавалёў, Цімафей Ільеўскі, Мікалай Рудкоўскі.

Налета ў нашай краіне будзе шырока адзначацца 500-годдзе беларускага кнігадрукавання. І ўжо сёння ідзе актыўная падрыхтоўка да гэтага маштабнага свята.

— Калі абмяркоўвалі папярэдні план мерапрыемстваў, то падумалі, што толькі класічных бібліятэчных, навуковых сустрэч, канферэнцый для свята будзе недастаткова. Нават сумнавата, — кажа **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, доктар педагагічных навук Раман МАТУЛЬСКІ.** — Францыск Скарына— велізарная постаць, амаль святы. Але разам з тым гэта і звычайны чалавек, які жыў на нашай зямлі, вучыўся, працаваў, ведаў ласку лёсу,

перажываў гора. Чаму ён пачаў друкаваць кнігі? Чаму стаў Скарынам? Чым ён жыў? З навуковага пункту гледжання адказаць на гэтыя пытанні вельмі цяжка. Але праз мастацтва, вобразы, творчую думку пісьменнікі, драматургі могуць даць свае адказы.

Так узнікла ідэя конкурсу. Яго арганізатарамі сталі Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, Нацыянальная бібліятэка, фінансавую падтрымку аказаў Беларусбанк. П'есы і сцэнічныя ідэі, прадстаўленыя на конкурс, не толькі расказваюць пра факты жыцця нашага выдатнага суайчынніка, але і падкрэсліваюць значнасць яго постаці ў кантэксце сучаснасці. Арганізатары атрымалі творы аўтараў з Мінска, Полацка, Брэста, Гомеля, Маладзечна, Віцебска, Докшыц, Масквы, Кіева і іншых гарадоў. Да ўдзелу ў творчым спаборніцтве было прадстаўлена 32 заяўкі ў намінацыях «Гістарычная п'еса», «Сучасная п'еса», «Сцэнічная ідэя».

Пераможцаў вызначыла кампетэнтнае журы на чале з мастацкім кіраўніком тэатра беларускай драматургіі, заслужаным дзеячам мастацтваў Беларусі Аляксандрам Гарцуевым. Так, найлепшай гістарычнай п'есай названы твор «Францыск Скарына. Прыпавесць» драматурга і рэжысёра з Брэста Цімафея Ільеўскага, у намінацыі «Сучасная п'еса» перамогу атрымаў Мікалай Рудкоўскі з Мінска і яго твор «Доктар свабодных навук», а ў намінацыі «Сцэнічная ідэя» адзначаны мінчанін Сяргей Кавалёў за п'есу «Юдзіф». Уладальнікамі дыпломаў І ступені сталі Сяргей Шыдлоўскі, Арына Андрэева, Міхаіл Туруноўскі, Віктар Марціновіч, а дыплом ІІ ступені атрымала Алена Іванюшанка.

Падчас урачыстай цырымоніі ўзнагароджання **дырэктар тэатра беларускай драматургіі Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ** зазначыў:

— Я спадзяюся, гісторыя атрымае працяг, гэтыя творы пачнуць сваё жыццё на сцэнічных пляцоўках Беларусі. Ведаю, што адна з п'ес будзе ставіцца ў магілёўскім тэатры, спадзяюся, пастаноўкі, прысвечаныя Скарыну, прадставяць і на сцэне ў Брэсце. А Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі парадуе гледачоў новым спектаклем ужо ў гэтым тэатральным сезоне.

Найлепшыя п'есы, што былі прадстаўленыя на конкурсе «Францыск Скарына і сучаснасць», пабачаць свет на старонках адмысловага зборніка. Выданне ўжо рыхтуецца ў Нацыянальнай бібліятэцы.